Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 21 (569) Субота, 30 мая 1964 г. Цана 1 кап. Год выдання XVII-ы

## Ідзе абарона дыпломных

### ІНТЭРВ'Ю СА СТАРШЫНЁЙ ДЭК

Карэспандэнт газеты «Беларускі ўніверсітэт» звярнуўся да старшыні дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі па аддзяленню рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта члена-карэспандэнта Акадэміі навук БССР І. В. Гутарава з просьбай расказаць, як праходзіць абарона дыпломных работ студэнтамі аддзялення. Вось што расказаў Іван Васільевіч Гутараў:

**Сёлета здаюць дзяржэкзамены і абараняюць дыпломныя работы студэнты дзённага, вячэрняга і завочнага навучання.**

**Выкладчыкі, метадысты і работнікі аддзелаў народнай адукацыі, якія скончылі тэарэтычны курс па завочнай сістэме, паспяхова абаранілі дыпломныя работы і рыхтуюцца да здачы дзяржэкзаменаў па гісторыі КПСС. Некаторыя з іх унеслі слушныя прапановы па далейшаму павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў (Т. Смірноў, В. Сюльжын). Цяжэй сябе адчуваюць у лінгвістыцы тыя завочнікі, якія працуюць не па прафесіі (Я. Сушкевіч, Т. Саковіч).**

**Студэнты стацыянара абараняюць толькі дыпломныя работы, але не здаюць экзамены. Першымі выдатныя адзнакі атрымалі студэнты Л. Рахліна, Б. Нікановіч.**

**Некаторыя таварышы не ўлічылі, што пры вызначэнні ацэнкі дыпломнай работы бярэцца пад увагу не толькі якасць яе выканання, але і агульная ідэйна-тэарэтычная, навуковая і практычная падрыхтоўка студэнтаў. Некаторыя студэнты добра напісалі свае работы, але слаба іх абаранялі (Аленева, Трэгубовіч, Чарнова), а іншыя добра адказвалі на пытанні, але не ўсё добра выклалі ў сваім даследаванні.**

**Да 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**

## У партыйным камітэце ўніверсітэта

Партыйны камітэт універсітэта распрацаваў план мерапрыемстваў па святкаванню 20-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Намечана правесці ўрачысты сход прафесарска-выкладчыцкага складу, студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта, прысвечаны слаўнай даце.

Бюро групы таварыства «Веды» даручана арганізаваць сустрэчы на факультэтах і ў акадэмічных групах з удзельнікамі баёў за вызваленне Беларусі і з удзельнікамі партызанскага руху ў Беларусі. Бюро групы таварыства «Веды» будзе праводзіць у гэтыя дні вялікую лекцыйную работу сярод насельніцтва і ў воінскіх часцях аб 20-й гадавіне вызвалення Беларусі.

Камітэту камсамола даручана арганізаваць турысцкія паходы па памятных месцах баёў і партызанскіх стаянак.

У чэрвені будзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка з імёнамі супрацоўнікаў універсітэта, якія загінулі ў баях Вялікай Айчыннай вайны.

У гэтыя дні будуць праводзіцца канферэнцыі чытачоў, абмеркаванні кніг, кінафільмаў, тэатральных пастановак, сустрэчы з пісьменнікамі, мастакамі, якія асвятляюць падзеі і дасягненні рэспублікі за пасляваенныя гады; будуць арганізаваны фотаілюстраваныя вітрыны, выстаўкі літаратуры, прысвечаныя перыяду вайны і пасляваеннаму будаўніцтву; будуць наладжаны выступленні калектываў мастацкай самадзейнасці на падшэфных прадпрыемствах, перад працоўнымі горада і рэспублікі, а таксама ў воінскіх часцях.

Ажыццяўленне гэтых мерапрыемстваў партыйны камітэт даручыў юбілейнай камісіі, у склад якой увайшлі: В. Д. Лапцёнак (старшыня), А. В. Кірсанаў, У. В. Цакуноў, В. І. Сцяпанаў, В. С. Далгарукаў, І. А. Мазжухін, У. М. Сікорскі, В. І. Дубовік, І. С. Бучурын, А. А. Царук, Г. Я. Рылюк, М. Я. Рэзнікаў, В. П. Шапялевіч, В. І. Калечыц, Р. Г. Любіна, М. Н. Юзэфовіч, І. Ф. Кастроў.

## ДА СЛАЎНАЙ ДАТЫ

У чацвер у 522-й аўдыторыі галоўнага корпуса адбылася студэнцкая навуковая канферэнцыя, прысвечаная 20-й гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На канферэнцыі было прачытана некалькі дакладаў, падрыхтаваных студэнтамі гістарычнага факультэта. Сярод іх: «Уклад беларускага народа ў справу разгрому нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны» (дакладчык — пяцікурснік У. Засінец), «Удзел чэхаў і славакаў у партызанскім руху на тэрыторыі Беларусі» (пяцікурсніца Я. Асіпкова), «Іх імёнамі названы вуліцы горада Мінска» (калектыўная праца навуковага гуртка студэнтаў 2-га курса). На канферэнцыі былі заслуханы паведамленні А. Сільвановіч, У. Шунякова, І. Мішур пра герояў вайны Мікалая Кедышку, Барыса Акрэсціна і Ціхана Бумажкова, імёнамі якіх названы вуліцы Мінска.

(Наш кар).

## ТРЭБА ВУЧЫЦЦА ПІСЬМЕННА ПІСАЦЬ!

У мінулым нумары газеты «Беларускі ўніверсітэт» было надрукавана пісьмо ў рэдакцыю майго аднакурсніка Аляксандра Несцяровіча. Ад імя нашага курса я адкажу яму на пытанне, чаму неабходна правядзенне дыктантаў.

А. Несцяровіч зусім слушна заўважыў, што ўніверсітэт не ставіць мэтай навучанне студэнтаў граматыцы. Тым не менш, мы лічым правядзенне дыктантаў неабходным. Па-першае, таму, што не ўсе студэнты змаглі авалодаць граматыкай рускай мовы ў школе і цяпер ім неабходна ліквідаваць прагалы. Па-другое, для таго, каб студэнты не забывалі правілы граматыкі і маглі час ад часу правяраць свае веды.

Зусім ясна, што «пісьменна пісаць журналісты павінны». Гэта словы Несцяровіча, а сам ён прынёс у рэдакцыю рукапіс з амаль дзесяткам памылак, у якім выступае супраць дыктантаў.

Несцяровіч не мае рацыі, сцвярджаючы, што дыктанты з'яўляюцца адзіным сродкам замацавання матэрыялу, пройдзенага па курсу сучаснай рускай мовы. Пасля кожнага семестра мы здаём залік па гэтаму прадмету. Значыцца, для праверкі і замацавання атрыманых ведаў у нас ёсць вялікая магчымасць.

Наш аднакурснік гаворыць пра тое, што на аддзяленні павінны «вучыць, як пісаць, што пісаць». І нас гэтаму вучаць. А атрыманыя веды кожны з нас можа выкарыстаць у сваіх выступленнях у друку. Таму няма неабходнасці ў правядзенні сачыненняў.

У канцы мне хочацца сказаць Несцяровічу яго ж словамі: «Зрабіў пяць памылак — атрымлівай «двойку». Значыцца, ты пісаць не умееш. Значыцца, вучыся пісаць пісьменна». Вось дзеля чаго нам патрэбны дыктанты.

Ала ДЗЕРАШ,
студэнтка 1 курса вяч. аддз. журналістыкі.

## ФОРУМ МАЛАДЫХ ЧЫТАЧОЎ

**З 28 чэрвеня па 29 кастрычніка 1964 года ў нашай краіне будзе праходзіць усесаюзная маладзёжная канферэнцыя чытачоў на тэму «Малады герой савецкай літаратуры».**

**Мэта канферэнцыі — папулярызацыя лепшых твораў, у якіх створаны вобразы маладых будаўнікоў камунізма, прыцягненне новых пісьменніцкіх сіл да стварэння яркіх кніг аб герою нашага часу.**

**Намечана многа тэматычных вечароў і дыспутаў, сустрэч юнакоў і дзяўчат з літаратарамі і работнікамі выдавецтваў. У дні канферэнцыі будзе шырока адзначана 60-годдзе з дня нараджэння выдатнага савецкага пісьменніка Мікалая Астроўскага, які ўвасобіў у вобразе Паўла Карчагіна ідэалы савецкай моладзі.**

**Найбольш актыўныя камсамольскія і бібліятэчныя работнікі, пісьменнікі — прапагандысты кнігі — будуць прадстаўлены да ўзнагароджання памятным значком з малюнкам М. Астроўскага, Ганаровымі граматамі ЦК ВЛКСМ.**

## Дэбют Наташы Глухавай

У нядзелю ў Мінскім парку Перамогі праводзіўся масавы лёгкаатлетычны крос на прызы рэспубліканскай маладзёжнай газеты «Чырвоная змена». Сярод пераможцаў кросу — выпускніца нашага ўніверсітэта Наташа Глухава. Яна ўпершыню выступала на кросавай дыстанцыі, але дэбют яе быў удалы. Наташа заваявала званне чэмпіёнкі горада сярод юніёрак на дыстанцыі 1000 метраў.



«Беларускай ленінкай» называюць часта Дзяржаўную бібліятэку БССР імя У. І. Леніна. У дні сесій яна ператвараецца ў своеасаблівы філіял вышэйшых навучальных устаноў горада. І гэта зразумела: цяжка знайсці больш зручнае месца для падрыхтоўкі да экзаменаў, чым бібліятэка.

Вяртаючыся да надрукаванага

## Рэдактару газеты „Беларускі ўніверсітэт“

**11 красавіка 1964 г. у газеце «Беларускі ўніверсітэт» напісана заметка «Дрэнная традыцыя». У ёй лабаранты кабінета гісторыі КПСС абвінавачваюцца ў тым, што яны пішуць непісьменныя аб'явы і вывешваюць на дзвярах кабінета.**

**Даводжу да Вашага ведама, што аб'яву, пра якую гаворыцца ў заметцы, лабаранты кабінета не пісалі, а пісаў яе студэнт 3-га курса гістфака Смаль Д.**

Заг. кабінета гісторыі КПСС ГАРБАЛЕНЯ.

## „САКРЭТ“ ПОСПЕХУ

Праўда, гэта ўжо не сакрэт. Пра нашу газету пісалі і гаварылі нямала. Таму мне застаецца дадаць зусім нямнога. Канешне ж, мы рады, што газета, першы поспех якой пачынаецца з часоў рэдактарства «класіка біяжурналістыкі» Мікалая Геся, не ўступіла першынства і на гэты раз.

Чым гэта растлумачваецца? Па-першае, традыцыямі, па-другое, пераемнасцю, па-трэцяе, любоўю да газеты. Галоўнае — наша газета ніколі не рабілася для птушкі ў справаздачы, кожны яе нумар мы чакалі, як стыпендыю. Газета патрэбна на факультэце, яе чытаюць такія паважаныя людзі, як прафесары і дацэнты, ёй пішуць словы ўдзячнасці выпускнікі.

Штогод мяняецца склад рэдкалегіі, але кожны год застаюцца ў ёй 2—3 «старых» газетчыкі — праваднікі традыцый. У гэтым годзе такім правадніком была Тамара Міхеева. Прыемна, што ў рэдакцыю прыйшлі новыя «сябры мае, газетчыкі», энтузіясты сваёй справы.

Толькі ў гэтым годзе ўвайшоў у наш калектыў Вася Цвігун, але яго ў нас лічаць ужо спрактыкаваным мастаком-афармляльнікам. Васю, таксама як і Валодзю Газезу, зразумела, не толькі грамадскі абавязак прымушае працаваць над афармленнем святочнага нумару да трох гадзін ночы. І не важна, што машыністка Света Фядосава яшчэ не робіць 3000 удараў у хвіліну, затое на выпуск нумару яе ўжо не трэба запрашаць — сама прыходзіць.

На факультэце рэдкалегію называюць самым дружным калектывам. Увогуле, гэта справядліва, хоць і ў нас ёсць так званыя «мёртвыя душы». У рэдакцыі любяць пагаварыць не толькі пра «справы газетныя», але і пачытаць вершы, паспрачацца аб прайшоўшым канцэрце або аб шансах мінскага «Дынама». У такой абстаноўцы асабліва добра знаёмішся з людзьмі.

Часценька злаваліся мы на фатографа Ваню Мінько, але бачылі б вы, з якой любоўю рабіў ён фатаграфіі ў ленінскі нумар газеты.

Міша Кукарэка выкрыў свой газетны талент на «сур'ёзных» заметках, але пасля гумарэскі «Ахвота горш няволі» мы рашылі даручаць Мішы нават самыя «несур'ёзныя» заданні.

Шмат дапамагае нам вучоба ў вялікіх газет. У будучым годзе нашым добрым памочнікам стане часопіс «Рабоче-крестьянский корреспондент».

Н. БАТУРЫЦКАЯ,
рэдактар газеты «За мичуринскую биологию».

*2-ю старонку сённяшняга нумару падрыхтавала да друку рэдакцыйная калегія насценгазеты „За мичуринскую биологию“*

